http://edoc.bseu.by

- с 1926 г. начинает свою деятельность Белорусский государственный еврейский театр БССР под руководством М. Рафальского, ставший одним из самых известных еврейских театров в СССР;

- в период с 1930-х до начала 1940-х гг. в Беларуси возникает сеть еврейских государственных театров;

- развитие профессионального еврейского театра в Беларуси оказывает большое влияние на распространение самодеятельного еврейского театрального творчества.

**Список использованных источников:**

1. Солопова, Е. В. Пуримшпили: пьесы еврейского народного театра / Е. В. Солопова // Национальный театр в контексте многонациональной культуры: шестые международные Михоэлсовские чтения : докл., сообщ. / [ред.-сост. А. А. Колганова] – М.: Российская гос. б-ка искусств : Три квадрата, 2010. – с. 63-70.

2. Выставка «Еврейский театр в Беларуси» [Электронный ресурс] / И. П. Герасимова // Мишпоха. – 2005. – № 19.

3. Гернштейн, А. Г. Судьба одного театра / А. Г. Гернштейн. – Минск: Изд-во «Четыре четверти», 2000. – 96 с.

4. Мальцев, В. В. Еврейский мир из еврейского окошка (А. Д. Дикий в БЕЛГОСЕТе) / В. В. Мальцев // Национальный театр в контексте многонациональной культуры: Архивы, библиотека, информация / Сост. А. А. Колганова. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 2004. – с. 89-103.

*А.Ф. Самусік, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*БДЭУ, г. Мінск*
a.f.samusik@gmail.com

# АРГАНІЗАЦЫЯ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XVIII СТАГОДДЗЯ

У сярэдзіне XVIII ст. езуіты і піяры на тэрыторыі Беларусі распачалі пад уплывам эпохі Асветніцтва працэс мадэрнізацыі вучэбных праграм уласных школ. Акрамя пашырэння колькасці выкладаемых дысцыплін ён прадугледжваў і прыданне іх выкладанню грамадзянска-патрыятычнай арыентацыі. Такі падыход, акрамя іншага, зрабіў неабходным увядзенне у вучэбныя праграмы інфармацыі паліталагічнага плану – наконт адметнасцяў дзяржаўнага ладу і магчымых шляхоў яго ўдасканалення.

Істотныя змены з гэтай нагоды адбыліся ў курсе рыторыцы. Настаўнік з выхаванцамі арганізоўваў “соймікі”, калі адзін з юнакоў абіраўся маршалкам (старшынёй), а іншыя прымалі ўдзел у абмеркаванні розных пытанняў, якія ў той час хвалявалі грамадства. “Дэпутаты” вучыліся гаварыць пераканаўча, разважліва, сцісла і па-сутнасці праблемы, прытрымліваца рэгламенту ды кантраляваць уласныя эмоцыі. Напрыканцы “паседжання” маршалак падводзіў асноўныя вынікі і агучваў сваё рашэнне, якое ставілася на галасаванне (з дазволам нязгодным з ім прымяніць права “liberum veto”) [1, с. 412-413].

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне падобных заняткаў зыходзіла з ведання выхаванцамі лепшых узораў выступленняў сенатараў ды паслоў сойма. У 1742 г. у Вільні выйшла “Інструкцыя аб прамовах на соймах і сойміках”. Яна ўключала 13 узорных тэкстаў выступленняў (С. Шчукі ў 1688 і 1699 гг., А. Тарла ў 1742 г. і г.д.), якія былі скіраваны супраць шляхецкай анархіі. Важнай стала і праца выхаванца калегіўмаў у Гродна і Навагрудку К. Галоўкі “Еўропа соймуючая” (Варшава, 1753), дзе параўновываліся формы парламентарызму (Рэч Паспалітая, Германія, Венгрыя, Швейцарыя), а таксама быў

змешчаны пералік айчынных сходаў і соймаў (1140-1726), адзначаны тыя, што былі сарваны дэпутатамі, апісвалася праца сойма Рэчы Паспалітай [2, с. 251, 588].

Арганізоваліся ж падобныя "соймікі" адпаведна загадаў кіраўніцтва Літоўскай правінцыі ордэна. Адзін з іх быў разасланы па школах 25 красавіка 1753 г. – у ім езуіцкі првінцыял С. Попел рэкамендаваў праводзіць іх у час збору сапраўдных шляхецкіх сходаў (соймікаў ці трыбуналаў), а выхаванцы пры напісанні прамоў павінны былі ўжываць усе назапашаныя імі веды па рыторыцы, антычнай, замежнай і айчыннай літаратуры, гісторыі [3, с. 111]. Але яшчэ і да гэтага вучнёўскія "соймікі" мелі публічны характар. У дзённіку вялікага гетмана ВКЛ кн. М.К. Радзівіла Рыбанькі ад 24 лютага 1745 г. застаўся запіс аб яго ўражаннях наконт наведвання падобнага мерапрыемства ў Нясвіжскай Рыцарскай акадэміі: "Добрая гэта рэч дзеля спрыту хлапцоў, абы снадней мовілі і з прэзэнцыяй, дырэктарам быў мой сын Януш" [4, с. 181].

Яшчэ адным вучэбным прадметам, дзе езуітамі выкладаліся асновы патрыятызма ды грамадзянскай адказнасці, з'яўлялася гісторыя. Першым выданнем з такой скіраванасцю зместа стаў падручнік будучага рэктара Віленскай акадэміі К. Бартольда (Брунсберг, 1721) "Апісанне дзяржаўнага ладу Польшчы". Аўтар лічыў, што гісторыя – гэта навука, якая настаўляе людзей у іх паўсядзённым жыцці і грамадскай дзейнасці. У якасці ж узору для пераймання ён называў караля Ст. Баторыя, здолеўшага праз адраджэнне моцы законаў пазбегнуць анархіі, але так і не схіліўшагася да дэспатыі [5, с. 55]. Адметны і 2-томны дапаможнік Я. Бельскага "Выгляд Каралеўства Польскага" (Познань, 1763), дзе толькі частка першага тому адводзілася апісанню гісторыі праўлення асобных каралей, а далей разглядаліся пытанні звязаныя з дзейнасцю манарха, урада, сойма і іншых палітычных інстытутаў. Сам аўтар адзначаў, што напісаў яго для таго: "Каб Шляхетная моладзь са сцен Школ у грамадства выходзіла падрыхтаваная такім чынам, каб… на Сойміках ды Соймах… у час міру і вайны, здольна была дапамагчы Каралеўству сваімі парадамі…" [6, с. X].

Што ж датычыцца піяраў, то ў падрыхтаваным кіраўнікам Польскай правінцыі ордэну С. Канарскім у 1754 г. Школьным статуце (на ВКЛ пашыраны ў 1762 г.) галоўнай мэтай адукацыі абвяшчалася прывіццё выхаванцам: "Гарачай любові да Айчыны, вернасці і паслухмянасці ўладзе, а таксама павагі да правоў ды дзяржаўных устаноў" [7, с. 5-11]. Дасягнуць гэтага меркавалася праз вывучэнне яго твора "Аб выхаванні сумленнага чалавека і добрага грамадзяніна". Ідэалам тут абвяшчаўся чалавек, які абараняе "усе правы чалавечага грамадства", вылучаецца маральнай чысцінёй, міласэрнасцю і спачуваннем да блізкіх, мае пачуццё абавязку ў адносінах да сяброў, знаёмых, падданых, улады і Радзімы. Пры гэтым С. Канарскі заклікаў захоўваць вернасць каралю, сенату і ўсім органам улады, падтрымліваць існуючыя парадкі ды законы: "Неабходна патрэбы прыватныя ставіць на другое месца пасля інтарэсаў грамадскіх і недаравальна пачынаць у Рэчы Паспалітай смуту ды шкодзіць ёй" [8, с. 44-45].

На занятках па рыторыцы піяры прапаноўвалі вучням да 200 тэм са свабодным выбарам для абмеркавання ў залежнасці ад "становішча ў краі і асабістай зацікаўленасці". Некаторыі з іх датычыліся праблем дзяржаўнасці: узаемаадносін цэнтральнай улады і грамадства (узмацненне аўтарытэту караля), дзейнасці соймаў (пераход да пастаяннай працы з правам прыняцця рашэнняў большасцю галасоў), саслоўяў (абавязковыя для ўсіх падаткі, больш простая працэдура пазбаўлення шляхецтва за несамавітыя ўчынкі) і г.д. Пры гэтым, часам азначаныя праблемы выносіліся на вучнёўскія "соймікі", якія ў піяраў таксама праводзіліся публічна. Настаўнікі раілі вучням весці сабе на іх стрымана і разважліва, каб паказаць прыклад сапраўдным тагачасным дэпутатам. Да таго ж, яны забаранялі ўжываць права "liberum veto", каб прадэманстраваць грамадству яго шкоднасць [9, с. 89-104].

Вельмі карысным для іх правядзення была кніга выкладчыка віленскага "Collegium Nobilium" Ю. Сямашкі "Разважанні аб палітычным стане дзяржаў еўрапейскіх" (Вільня, 1769), дзе аналізавася сучаснае становішча еўрапейскіх краін ды Рэчы Паспалітай з пункту

эвалюцыі іх дзяржаўнага ладу, гаспадаркі, войска і г.д. Наконт уласнай краіны ён пісаў аб яе памерах, колькасці насельніцтва (ад 6 да 8 мільёнаў "па розных крыніцах"), значным экспарце збожжа ў тую ж Галандыю, крытыкаваў права "liberum veto" ды адзначаў, што пераадоленне анархіі зрабіла бы Рэч Паспалітую адной з вядучых дзяржаў кантынента [10, с. 150-157].

Што ж датычыцца гісторыі, то ў піяраў у азначаны час яна праходзілася, пераважна, у сусветным кантэксце і з ужываннем інфармацыі з паліталогіі ды геаграфіі. Найперш тут трэба назваць падручнік Т. Вагі (Супрасль, 1767). Агляд мінулага Польшчы і ВКЛ даводзіўся ім да 1766 г. і прадугледжваў разгляд не толькі ўчынкаў асобных манархаў, але і асноўных рашэнняў соймаў [11, с. 353-392]. У сваю чаргу, К.Ю. Скшэтускі надрукаваў абагульняючы падручнік па сусветнай палітычнай гісторыі (Варшава, 1773). У дачыненні да Рэчы Паспалітай тут акрамя сціплага нарысу яе гісторыі, разглядаліся пытанні злучэння Польшчы і ВКЛ у адзіную дзяржаву, а таксама "вольнага абрання" манархаў. Асобна аўтар аналізаваў і прычыны заняпаду дзяржавы, вылучаючы з іх ліку – шляхецкую анархію, адсутнасць пастаянных дыпламатычных місій пры еўрапейскіх дварах, слабую армію, нізкі ўзровень грамадзянскай самасвядомасці і інш. [12, с. 78-94, 292-309]

У цэлым, не выклікае сумненняў, што у сярэдзіне XVIII ст. заняткі па рыторыцы і гісторыі сапраўды набылі грамадзянска-патрыятычную афарбоўку. Мэта падобных захадаў заключалася ў жаданні паглыбіць веданне выхаванцамі спецыфікі ды гісторыі Рэчы Паспалітай і такім чынам выпрацаваць у іх актыўную жыццёвую пазіцыю. Вынікам жа стала ўзрастанне ў краіне колькасці прыхільнікаў удасканалення айчыннай палітычнай сістэмы. Падтрымка гэтых колаў грамадства, згуртаваных вакол "Фаміліі" кн. Чартарыйскіх і дазволіла каралю Станіславу Аўгусту пасля свайго абрання прадпрыняць шэраг захадаў у агульным для тагачаснай Еўропы рэчышчы "асветнага праўлення".

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Bednarski, S. Upadek i odrodzenie skol jezuickich w Polsce / S. Bednarski. – Kraków : Wyd-wo księży ezuitow, 1933. – 538 s.
2. Estreicher, K. Bibliografia polska : w 4 cz. ; 37 t. / K. Estreicher. – Kraków : Druk. Un-tu Jagiellońskiego, 1870-1939. – Cz. 3. – T. 7. – 1901. – 705, VI s.
3. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Беларуси / Т.Б. Блинова. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 425 с.
4. Дыярыюш кн М.К. Радзівіла // Спадчына. – 1995. – № 1. – С. 170-199.
5. Самусик, А.Ф. Историческая наука на белорусских землях в XVIII в. : общий уровень и направления развития / А.Ф. Самусик // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Вып. 27. – 2012. – С. 54-58.
6. Bielski, J. Widok Krolestwa Polskiego ze wszystkiemi wojewodztwami, xięstwy y ziemiami, monarchiniami : w 2 t. / J. Bielski. – Poznań : J.K. Mci Collegium Poznańskiego Societatis Jesu, 1763. – T. 1. – XIII, 368 s.
7. Majchrowicz, F. Wielka reforma czkolna ks. Stanisława Konarskiego i Komisji Edukacji Narodowej / F. Majchrowicz. – Lwów : "Książnica Polska", 1923. – 80 s.
8. Bartnicka, K. Koncepcje wychowania obywatelskiego i patriotycznego w szkołach Komisji Edukacji Narodowej / K. Bartnicka // Rozprawy z Dziejów Oświaty. – 1973. – T. 16. – S. 41-67.
9. Kurdybacha, Ł., Działalność pedagogiczna S. Konarskiego / Ł. Kurdybacha. – Wrocław ; Warszawa : Zakład narodowy im Ossolińskich, 1957. – 132 s.
10. Siemaszko, J. Zdania o stanie politycznym państw europejskich / J. Siemaszko. – Wilno : Druk. Pijarów, 1769. – XIII, 176 s.
11. Waga, T. Krotkie Zebranie Historyi y Geografii Polskiey / T. Waga. – Supraśl : Druk. Bazylianów, 1767. – 392 s.

12. Skrzetuski, K.J. Historya Polityczna Dla Szlachetney Młodzi / K.J. Skrzetuski. – Warszawa : Druk. Pijarów, 1777. – IV, 429 s.

*І.І. Сацукевіч, магістр гісторыі,*
*БДЭУ, г. Мінск*
ivansat@rambler.ru

# ПАМЯЦЬ ПРА ПОДЗВІГ НАРОДА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў НАЗВАХ ВУЛІЦ МІНСКА

Працэс мемарыялізацыі партызан і падпольшчыкаў у назвах вуліц Мінска шмат у чым адлюстроўваў адносіны камуністычнай партыі да падпольнага і партызанскага руху. Старт кампаніі па найменаванні вуліц у гонар удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны у Мінску быў дадзены ў пачатку 1947 г., калі новыя вуліцы мікрараёна прыватнай забудовы каля вул. Валгаградскай атрымалі імёны Гастэлы, Даватара, Панфілава, Чарняхоўскага, Ватуціна, Матросава [10, арк. 51]. Знайшлося сярод іх і месца для партызанаў. Так, адна з вуліц была названа ў гонар З. Касмадземьянскай , а другая – К. Заслонава.

У наступным 1948 г. новая вуліца каля Аўтазавода стала праспектам Чырвоных партызан [11, арк. 39]. Чаму для гэтага была выбрана менавіта такая назва і месца, становіцца ясна, калі адкрыць карту Мінска. Пачынаецца праспект Чырвоных партызан (сёння – вул. Цэнтральная) ад Магілёўскай шашы, па якой у Мінск 16 ліпеня 1944 г. ўвайшлі для ўдзелу ў парадзе беларускія партызаны. У Мінску ўжо існавала вул. Партызанская, названая яшчэ ў 1920-я гг. у гонар Козыраўскіх партызан, якія выступалі супраць немецкіх акупантаў у 1918 г. Таму ў 1948 г. з’явіўся менавіта праспект Чырвоных партызан.

У 1949 г. адна з вуліц Трактаразаводскага пасёлка была названа ў гонар члена падпольнай групы “Маладая гвардыя” А. Кашавога, вядомасць пра якога шырылася ў тыя гады на ўвесь СССР. У наступным годзе найменаваннем вуліцы ў Мінску была ўшанавана памяць аднаго з першых партызан Герояў Савецкага Саюза, Ц. Бумажкова [12, арк. 162]. Далей амаль 10 год ніякіх новых найменаванняў у гонар удзельнікаў партызанскага і падпольнага руху не было. Калі не лічыць адну маленькую вулачку на ўскраіне Мінска, названую ў гонар легендарнага дзеда Талаша ў 1957 г.

Часы хрушчоўскай “адлігі” прынеслі змены і ў гарадскую тапаніміку. Так, у 1959 г. пачалася мемарыялізацыя ўдзельнікаў Мінскага антыфашысцкага падполля, калі рашэннем Бюро ЦК КПБ было афіцыйна прызнана існаванне і дзейнасць разгалінаванага падполля ў Мінску [1, с.168]. Ужо ў наступным 1960 г. гэта знайшло адлюстраванне на вулічных шыльдах Мінска: рашэннем Мінскага гарадскога савета вул. Іпадромная была перайменавана ў гонар аднаго з актыўных дзеячаў Мінскага падполля, Героя Савецкага Саюза М. Кедышкі [9, арк.515]. На доме, дзе знаходзіўся штаб падпольнай арганізацыі “Андруша”, стваральнікам якой з’яўляўся М. Кедышка (вул. Магілёўская, 68), была ўсталявана мемарыяльная дошка. Цікава, але рашэнне аб ушанаванні памяці Кедышкі было прынята разам з перайменаваннем вул. Зялёнае кола ў гонар В. Харужай – аднаго з арганізатараў партыйнага падполля ў Віцебску. У гэтым можна ўбачыць асцярожнасць, з якой падыходзілі партыйныя ўлады да прызнання Мінскага падполля. Разам з тым зноў пачалі называць вуліцы ў гонар партызан: у 1961 г. невялікая вулачка ў былой вёсцы Вілкаўшчына атрымала імя Марата Казея.

Прызнанне Мінскага падполля адбылося, і заставалася толькі чакаць зручнага моманту для ўключэння “падпольнага” пытання ў тэматыку Вялікай Айчыннай вайны. І такі момант наступіў у 1964 г., калі адбылося шырокае святкаванне 20-годдзя вызвалення